Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. АЎТОРАК № 202 (28060) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Шаўковай дарогай да Мінска**

СТАР. 8

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Амерыканскі пісьменнік пра наш шлях**



**Захаваць жыццё маці**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«У Еўропе прыходзіць разуменне таго, што Беларусь не з'яўляецца падбухторшчыцай неспакою ў рэгіёне, а наадварот, стала донарам стабільнасці і бяспекі. Разам з еўрапейцамі мы працуем над вырашэннем сумесных задач: барацьба з нелегальнай міграцыяй, наркатрафікам, міжнароднай злачыннасцю. Беларусь таксама забяспечвае надзейны транзіт энергарэсурсаў. Мы робім шмат іншага для таго, каб еўрапейскі кантынент спакойна жыў і развіваўся. Таму наяўнасць нармальных гандлёва-эканамічных, палітычных, гуманітарных і іншых адносін — у інтарэсах не толькі Беларусі, але і ўсёй Еўропы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17179,00 | ▼ |
| Еўра | 19503,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279,40 | ▼ |
| Укр. грыўня | 792,57 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Сырадой з дастаўкай



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Гярчаны Браслаўскага раёна Міраслава ПЯТРОВІЧ спяшаецца дадому пасля дзённай дойкі. Яе вёдры поўныя сырадою. Пакуль дазваляе надвор'е, яе рахманыя рагулі Чумічка і Цыганка цэлы дзень пасвяцца на полі і на апошняй траве нагульваюць тлустае малако. У адрозненне ад іншых вясковых гаспадынь, Міраслава, якая працуе на ферме мясцовага сельгаспрадпрыемства, не здрадзіла спрадвечнаму звычаю і трымае на сваім падворку нават не адну карову. Бо ад сваёй кароўкі малако і смачнейшае, і саладзейшае.

## ■ Інвестыцыі ў будучыню

# У ДЗІЦЯЧЫ САДОК — З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ,

## або Што пра дашкольную адукацыю думаюць бацькі

**«Калі б вы працавалі ў Міністэрстве адукацыі і адказвалі за дашкольную адукацыю, вырашэннем якіх пытанняў заняліся б у першую чаргу?» Адказаць на гэта пытанне прапанавалі бацькам, дзеці якіх наведваюць дашкольныя ўстановы. Цікава, што бацькі на першае месца паставілі павышэнне заробкаў выхавальнікам і іх памочнікам. А матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і фінансаванне ўстаноў адукацыі яны паставілі толькі на другое месца.**

**У рамках міжнароднага форуму «Развіццё сістэмы дашкольнай адукацыі: інвестыцыі ў будучыню» былі агучаны вынікі даследавання якасці адукацыйных паслуг ва ўстановах дашкольнай адукацыі і задаволенасці бацькоў гэтымі паслугамі. Рэспандэнтамі сталі 200 выхавальнікаў і 400 бацькоў, дзеці якіх наведваюць дзіцячыя садкі — з Мінска, абласных цэнтраў, сярэдніх і невялікіх гарадоў з насельніцтвам да 50 тысяч чалавек.**



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

### ПРОПУСК У ДЗІЦЯЧЫ САД

Напрыклад, у бацькоў пацікавіліся, ці даводзілася ім пры ўладкаванні дзіцяці ў дашкольную ўстанову дадаткова прыкладаць нейкія намаганні? Большасць бацькоў канстатавалі, што нічога дадаткова не рабілі (62%). Аднак трэць апытаных прызналіся, што ім давялося аказваць дашкольнай установе спонсарскую падтрымку. 7% паведамілі, што шукалі ўплывовых знаёмых, а 3% (яны самі або іншыя члены сям'і) былі вымушаны ўладкоўвацца на працу ў дашкольную ўстанову, каб туды прынялі іх дзіця. Як правіла, звяртацца да дадатковых мер даводзілася бацькам, якія хацелі ўладкаваць у дашкольныя ўстановы дзяцей ва ўзросце да трох гадоў.

У адпаведнасці з Кодэксам «Аб адукацыі», напаўняльнасць груп у дзіцячых садках (малодшай, сярэдняй і старшай) не павінна перавышаць 20 выхаванцаў.

СТАР. 4

## ■ Надвор'е

# Суцэльная непагадзь

## А ў сераду сіноптыкі абяцаюць дажджы з мокрым снегам

**На гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі завітае сапраўдная дажджлівая восень, паведаміў <u>начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ</u>.**

Ужо сёння да нас завітаюць атмасферныя франты, таму ўдзень пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 5-11 градусаў. Цалкам сапсуецца надвор'е ў краіне ў сераду і чацвер. Добрую порцыю вільгаці прынясе нам цыклон, які будзе праходзіць уздоўж паўднёвых межаў краіны. Часам будуць ісці дажджы, ва ўсходніх раёнах краіны — з мокрым снегам. Тэмпература паветра ўначы на сераду чакаецца ад 1 да 8 цяпла, па паўночным усходзе замаразкі — да 0 — мінус 3 градусаў, удзень — плюс 2-9 градусаў. Уначы на чацвер будзе без замаразкаў, але толькі ад 0 да плюс 6 градусаў, удзень — 2-9 цяпла. Сіноптыкі прагназуюць, што ў пятніцу надвор'е будзе вызначаць атмасферны фронт з Заходняй Еўропы, які прынясе на большую частку тэрыторыі кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 2-7 градусаў, удзень — ад 5 да 11 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у выхадныя дні чакаецца павелічэнне атмасфернага ціску і дажджоў стане менш. У суботу ўдзень кароткачасовыя дажджы прагназуюцца толькі месцамі. Тэмпература паветра ўначы будзе 2-8 цяпла, удзень пацяплее да плюс 5-11 градусаў. Без ападкаў будзе пераважна ў нядзелю. Уначы і раніцай месцамі прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень — 6-12 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*